**А. В. Солахаў** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# УТВАРЭННЕ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ З ПРЫСТАЎКАЙ *АНТЫ-* Ў МОВЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Прэфікс *анты-* ўзыходзіць да грэчаскага *anti* ‘супраць’ [3, с. 104]. Пры дапамозе яго ва ўсходнеславянскіх мовах утвараюцца назоўнікі і прыметнікі, якія абазначаюць супрацьлеглыя або супрацьпастаўленыя паняцці, з’явы і прыметы.

Разгледзім утварэнне індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў з прыстаўкай *анты-* ў мове сучаснай беларускай паэзіі.

У беларускай мове, паводле «Беларускай граматыкі», назоўнікі з гэтым прэфіксам абазначаюць супрацьлеглае, процідзейнае таму, што названа ўтваральным словам [2, с. 276]. Яны набываюць прадуктыўнасць у астранамічнай тэрміналогіі і ўключаць у свой склад запазычаныя, пераважна інтэрнацыянальныя лексемы [1, с. 324].

Прыметнікі з прэфіксам *анты-* абазначаюць прымету, супрацьлеглую або супрацьпастаўленую той, што названа ўтваральным словам [2, с. 311].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Паводле семантычнай сувязі з утваральным прыметнікам сярод іх вылучаюць тры падтыпы:

1) прыметнікі, што абазначаюць прымету, процілеглую той, якая названа ўтваральным прыметнікам (*антыгістарычны*);

2) прыметнікі са значэннем ‘накіраваны супраць таго, што названа назоўнікам, якім у сваю чаргу матываваны суфіксальны ўтваральны прыметнік’ (*антываенны* ‘накіраваны супраць вайны’);

3) прыметнікі са значэннем ‘накіраваны супраць таго, што названа словазлучэннем з утваральным прыметнікам у якасці азначэння’ (*антыгадзючны* ‘накіраваны супраць заражэння ядам гадзюкі’) [1, с. 332]. Тып набывае прадуктыўнасць у сферы грамадска-палітычнай і навукова-тэхнічнай тэрміналогіі [2, с. 276].

У мове сучаснай беларускай паэзіі ўтвараюцца індывідуальна-аўтарскія як назоўнікі, так і прыметнікі.

Індывідуальна-аўтарскія назоўнікі абазначаюць:

1) жанры літаратурных твораў: *антыбайка* (< байка), *антыбалада* (< балада), *антысанет* (< санет): *Зязюлі хацелася надта Наседзець самой антыяйкі, Каб вывесці антыпернатых Для* ***антыбайкі****...* (Р. Барадулін); *Гісторыка-геаграфічная* ***антыбалада*** (падзагаловак да верша «Пірогі і пірагі») (В. Зуёнак); ***антысанет*** (назва санета) (М. Танк);

2) астранамічныя аб’екты: *антысонца* (< сонца): *Толькі хуткасць. І чорныя «дзіры» Гараць* ***Антысонцамі****: Мёртвыя – Не патухаюць* (В. Зуёнак);

3) парныя або зборныя паняцці: *антыпара* (< пара), *антынарод* (< народ): *Прыйшла да антыквара З вяселля* ***антыпара*** (Р. Барадулін); *Я думаў у гэтыя дні, Маргот, што ёсць народ і* ***антынарод****?* (А. Вярцінскі);

4) часткі цела чалавека: *антыгалава* (< галава), *антытвар* (< твар): З *гадамі сена здасца муравою, І пачынаюць болей галавою Пісацца дужа правільныя вершы, І адпаведна ўжо настрой, як шэршань, Гудзе, і думку абвівае лой. І вершы пішуць* ***антыгалавой*** (Р. Барадулін); *Жахнуўся антыквар – Прапаў ягоны* ***антытвар!*** (Р. Барадулін);

5) птушак і прадуктаў іх жыццядзейнасці: *антыпернатыя* (< пернатыя), *антыяйкі* (< яйкі): *Зязюлі хацелася надта Наседзець самой* ***антыяйкі****, Каб вывесці* ***антыпернатых*** *Для антыбайкі...* (Р. Барадулін);

6) прадметы: *Прыйшла да антыквара З вяселля антыпара: – Калі ўжо антыквар ты, Прадай нам* ***антыкварты****...* (Р. Барадулін);

7) прадукты харчавання: *антыежа* (< ежа): *Мне зорны бляск тугою вочы рэжа. Агорне сум – няўцям, чаго хачу. Вось хіба з’ем талерку* ***антыежы*** *І за табою следам палячу* (Г. Юрчанка);

8) абстрактныя паняцці: *Нашто гадаць, якая* ***антысіла*** *Цябе з зямлі узнесла да планет, Калі з тых пор мне горкі і нямілы Не толькі свет,* а *нават антысвет* (Г. Юрчанка);

МГПУ им. И.П.Шамякина

9) міфічных істот: *антыродзіч* (< родзіч): *О, хіжыя цыклопы і цыклопы, Калі ж вас* ***антыродзічы*** *змятуць?..* (М. Чарняўскі).

Як паказваюць прыведзеныя вышэй прыклады, семантычна індывідуальна-аўтарскія назоўнікі больш разнастайныя, чым узуальныя, і, у адрозненне ад іх, валодаюць экспрэсіўнасцю, якая праяўляецца па-рознаму ў кожным з іх. Яны ўжываюцца для стварэння моўнай гульні, іроніі: *Зязюлі хацелася надта Наседзець самой* ***антыяйкі****, Каб вывесці* ***антыпернатых*** *Для* ***антыбайкі...*** (Р. Барадулін); *Мне зорны бляск тугою вочы рэжа. Агорне сум – няўцям, чаго хачу. Вось хіба з'ем талерку* ***антыежы*** *І за табою следам палячу* (Г. Юрчанка).

Акрамя таго, прэфікс *анты-* можа далучацца да ўласных імён: *анты-Нестар* (< Нестар): *І [фашысцкая «рама»] засекла цэль, каб у рэестры Слаўных і вялікіх перамог Новы летапісец –* ***анты-Нестар*** *– І маю душу занесці мог* (В. Зуёнак). Каб зразумець сэнс утворанага аказіяналізма, неабходна разабрацца, хто такі той, які абазначаны ўтваральным словам. Нестар жыў у канцы XI – пачатку XII ст., быў манахам Кіева-Пячэрскага манастыра. Ён вядомы як усходнеславянскі пісьменнік і гісторык, адзін з заснавальнікаў летапіснага жанру на Русі. Яго пяру належаць «Чытанне пра жыццё і гібель Барыса і Глеба» і «Жыціе Фядосія Пячэрскага». «У сваіх творах побач з пропаведдзю хрысціянства, – сцвярджае В. А. Чамярыцкі, – праводзіў ідэю адзінства і незалежнасці Русі ад Візантыі, асуджаў міжкняжацкія ўсобіцы. […] У майстэрстве гістарычнага апавядання дасягнуў высокай дакладнасці, прастаты і жывасці выкладу» [5].

Пры дапамозе індывідуальна-аўтарскага назоўніка *анты-Нестар* аўтар стварае складаны мастацкі вобраз, экспрэсіўнасць якога павялічваецца эфектам нечаканасці такога ўтварэння.

У сістэме словаўтварэння індывідуальна-аўтарскіх прыметнікаў прыстаўка *анты-* ў мове сучаснай беларускай паэзіі выкарыстоўваецца радзей. Зафіксаваны наступныя дэрываты:

*антыабстрактны* 'супрацьлеглы абстрактнаму; рэальны': *У галаве яго цяпер раіліся І бушавалі яркія ўяўленні: Зусім рэальная,* ***антыабстрактная****, Засмажаная ў саганку свініна, Румяныя скрылькі тушонай бульбы...* (Н. Гілевіч). Экспрэсія індывідуальна-аўтарскага прыметніка-неалагізма ў дадзеным выпадку атрымлівае адгерэнтны характар: слова набывае экспрэсіўнасць у кантэксце, выступаючы сінонімам да прыметніка *рэальны* і ўдакладняючыся словазлучэннем канкрэтнага зместу *засмажаная ў саганку свініна*, супрацьпастаўленага абстрактнай семантыцы нававтора;

*антыдачны* 'накіраваны супраць таго, што названа назоўнікам, якім у сваю чаргу матываваны суфіксальны ўтваральны прыметнік': *Ах, які сацыяльна значны, Дэмагогам – падвох : Эпас пісаў* ***антыдачны,*** *Пакуль дачы ўзяць не мог!* (А. Лойка). Унутраная форма індывідуальна-аўтарскага

МГПУ им. И.П. Шамякина

прыметніка-неалагізма агаляецца за кошт ужывання аднакаранёвага слова *дача,* што і робіць яго экспрэсіўным;

*антымяшчанскі* 'накіраваны супраць таго, што названа назоўнікам, якім у сваю чаргу матываваны суфіксальны ўтваральны прыметнік':
*Мацнее дух* ***антымяшчанскі****, ваюе праўды свет з маной* (В. Жуковіч).

І. С. Улуханаў адзначае, што «ў аказіянальнай лексіцы можа рэалізоўвацца магчымасць функцыянавання фарманта або яго асобных значэнняў у словах той часціны мовы, у якой узуальна ён або яго значэнне не прадстаўлены. Пры гэтым звычайна адначасова можа пашырацца і часцінамоўная спалучальнасць афікса» [4, с. 114–115].

Пашырэнне часцінамоўнай ужывальнасці датычыцца і прэфікса *анты-*, які пашырае свае магчымасці за кошт далучэння да займеннікаў і дзеясловаў. Так, далучаючыся да асабовага займенніка *я*, прыстаўка *анты-* ўтварае займеннік з супрацьлеглым значэннем *анты-я*: *Бо я даўно жыву, як выключэнне, Як водбліск-цень зямнога быція, Таму падчас грызе мяне сумненне: Я – гэта я ці, можа,* ***анты-я****?* (Г. Юрчанка). Самі па сабе прэфікс *анты-* і займеннік *я* экспрэсіўна нейтральныя. Аднак, аб'ядноўваючыся, яны ўтвараюць слова, у якім закладзены моцны згустак іроніі. Экспрэсія ствараецца за кошт таго, што значэнні асобных кампанентаў гэтага слова супярэчаць адно другому.

Словаўтваральнае значэнне 'выконваць дзеянне, супрацьлеглае таму, якое названа ўтваральным словам' атрымлівае індывідуальна-аўтарскі дзеяслоў-неалагізм *анты-жыць*, утвораны пры дапамозе прыстаўкі *анты-*, не ўласцівай для сістэмы дзеяслоўнага словаўтварэння: *Надзея, хісткі човен мой, Круг ратавальны, Над бессмяротнаю турмой Мой знак астральны На галактычным рубяжы, На тым прадонні, Дзе «жыць» выходзіць* ***«анты-жыць»****, «Ніколі» – «сёння»* (В. Зуёнак). І ў гэтым выпадку экспрэсія ўтворанага слова ўзрастае, таму што значэнні паміж яго кампанентамі прыходзяць у супярэчнасць.

Такім чынам, у мове сучаснай беларускай паэзіі прэфікс *анты-* часцей выкарыстоўваецца пры ўтварэнні індывідуальна-аўтарскіх назоўнікаў і прыметнікаў, найбольш прадуктыўнымі з якіх з'яўляюцца субстантывы. Семантычна яны living рознапланавыя. Прэфікс *анты-* далучаецца не толькі да агульных назоўнікаў, але і да ўласных. Адначасова адзначаецца пашырэнне яго часцінамоўнай ужывальнасці за кошт далучэння да займеннікаў і дзеясловаў.

Індывідуальна-аўтарскія неалагізмы з прэфіксам *анты-* ў мове сучаснай беларускай паэзіі выконваюць экспрэсіўную функцыю, функцыю моўнай гульні, з'яўляюцца сродкамі стварэння складаных мастацкіх вобразаў і іроніі.

**Літаратура**

1. Антанюк, Л. А. Словаўтварэнне часцін мовы / Л. А. Антанюк // Беларуская мова: лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – С. 322–341.

МГПУ им. И.П.Шамякина

2. Беларуская граматыка: у 2-х ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 431 с.

3. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 1: А–Л. – 736 с.

4. Улуханов, И. С. Единицы словообразовательной системы русского языка и их лексическая реализация / И. С. Улуханов; Российская академия наук, Институт русского языка им. В. В. Виноградова. – М., 1996. – 221 с.

5. Чамярыцкі, В. А. Нестар / В. А. Чамярыцкі // Беларуская Энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2000. – Т. 11: Мугір – Паліклініка. – С. 297.

МГПУ им. И.П.Шамякина